# Your English language grammar assistant

# Ваш памочнік па граматыцы англійскай мовы

## UNIT 1

### The verb to be / Дзеяслоў быць

| Positive (+) | | Negative (–) | |
|---|---|---|---|
| **Long form** | **Short form** | **Long form** | **Short form** |
| I **am** happy. | I**’m** happy. | I **am not** sad. | I**’m not** sad. |
| You **are** happy. | You**’re** happy. | You **are not** sad. | You **aren’t** sad. |
| He **is** happy. | He**’s** happy. | He **is not** sad. | He **isn’t** sad. |
| She **is** happy. | She**’s** happy. | She **is not** sad. | She **isn’t** sad. |
| It **is** happy. | It**’s** happy. | It **is not** sad. | It **isn’t** sad. |
| We **are** happy. | We**’re** happy. | We **are not** sad. | We **aren’t** sad. |
| You **are** happy. | You**’re** happy. | You **are not** sad. | You **aren’t** sad. |
| They **are** happy. | They**’re** happy. | They **are not** sad. | They **aren’t** sad. |

| Question (?) | Short answer | |
|---|---|---|
| | + | – |
| **Are** you from Britain? | Yes, I **am**.<br>Yes, we **are**. | No, I**’m** not.<br>No, we **are**n’t. |
| **Is** he from Britain? | Yes, he **is**. | No, he **is**n’t. |
| **Is** she from Britain? | Yes, she **is**. | No, she **is**n’t. |
| **Is** it from Britain? | Yes, it **is**. | No, it **is**n’t. |
| **Are** they from Britain? | Yes, they **are**. | No, they **are**n’t. |

# The verb to have got / Дзеяслоў мець

| Positive (+) | | Negative (–) | |
|---|---|---|---|
| Long form | Short form | Long form | Short form |
| I **have got** a toy. | I'**ve got** a toy. | I **have not got** a toy. | I **haven't got** a toy. |
| You **have got** a toy. | You'**ve got** a toy. | You **have not got** a toy. | You **haven't got** a toy. |
| He **has got** a toy. | He'**s got** a toy. | He **has not got** a toy. | He **hasn't got** a toy. |
| She **has got** a toy. | She'**s got** a toy. | She **has not got** a toy. | She **hasn't got** a toy. |
| It **has got** a toy. | It'**s got** a toy. | It **has not got** a toy. | It **hasn't got** a toy. |
| We **have got** a toy. | We'**ve got** a toy. | We **have not got** a toy. | We **haven't got** a toy. |
| They **have got** a toy. | They'**ve got** a toy. | They **have not got** a toy. | They **haven't got** a toy. |

| Question (?) | Short answer | |
|---|---|---|
| | + | – |
| **Have** you **got** green eyes? | Yes, I **have**.<br>Yes, we **have**. | No, I **have**n't.<br>No, we **have**n't. |
| **Has** he **got** a toy? | Yes, he **has**. | No, he **has**n't. |
| **Has** she **got** a toy? | Yes, she **has**. | No, she **has**n't. |
| **Has** it **got** a toy? | Yes, it **has**. | No, it **has**n't. |
| **Have** they **got** a computer? | Yes, they **have**. | No, they **have**n't. |

# The verb can / Дзеяслоў умець, магчы

| Positive (+) | Negative (–) | |
|---|---|---|
| | Long form | Short form |
| I **can** run. | I **cannot** sing. | I **can't** sing. |
| You **can** run. | You **cannot** sing. | You **can't** sing. |
| He **can** run. | He **cannot** sing. | He **can't** sing. |
| She **can** run. | She **cannot** sing. | She **can't** sing. |
| It **can** run. | It **cannot** sing. | It **can't** sing. |
| We **can** run. | We **cannot** sing. | We **can't** sing. |
| They **can** run. | They **cannot** sing. | They **can't** sing. |

| Question (?) | Short answer | |
|---|---|---|
| | + | – |
| **Can** I go out? | Yes, you **can**. | No, you **can**'t. |
| **Can** you jump? | Yes, I **can**.<br>Yes, we **can**. | No, I **can**'t.<br>No, we **can**'t. |
| **Can** he jump? | Yes, he **can**. | No, he **can**'t. |
| **Can** she jump? | Yes, she **can**. | No, she **can**'t. |
| **Can** it jump? | Yes, it **can**. | No, it **can**'t. |
| **Can** we go out? | Yes, you **can**. | No, you **can**'t. |
| **Can** they jump? | Yes, they **can**. | No, they **can**'t. |

Дзеяслоў **can** ужываецца для таго, каб сказаць ці спытацца пра тое, што хтосьці ўмее або не ўмее рабіць, напрыклад:

I **can** speak English.
My brother **can't** dance.

Дзеяслоў **can** ужываецца таксама для выказвання просьбы або дазволу, напрыклад:

**Can** I go out?
**Can** I borrow a pencil?
**Can** you close the door, please?

# UNIT 2

## Pronouns / Займеннікі

| **Personal pronouns / Асабовыя займеннікі** (адказваюць на пытанні «хто?», «што?») | **Possessive pronouns / Прыналежныя займеннікі** (адказваюць на пытанні «чый?», «чыя?», «чыё?», «чые?») |
|---|---|
| **I** я | **my** мой |
| **you** ты | **your** твой |
| **he** ён | **his** яго |
| **she** яна | **her** яе |
| **it** ён, яна, яно | **its** яго, яе |
| **we** мы | **our** наш |
| **you** вы | **your** ваш |
| **they** яны | **their** іх |

Асабовыя займеннікі ўжываюцца замест назоўнікаў у ролі дзейніка, напрыклад:

Maggie likes tea. = **She** likes tea.

Займеннік **it** ужываецца замест назоўнікаў, якія абазначаюць неадушаўлёныя прадметы або жывёл, напрыклад:

Look at the kitten. **It**’s funny.

Але калі жывёліна з’яўляецца хатнім любімцам, замест яе назвы ці імя ўжываецца асабовы займеннік **he** / **she**, напрыклад:

I’ve got a budgie. **He**’s funny.

Форма займенніка **you** супадае ў адзіночным і множным ліках: you (ты) = you (вы), напрыклад:

Where do **you** live? – **I** live in Minsk. / **We** live in Minsk.

Займеннік **I** заўсёды пішацца з вялікай літары.

За прыналежным займеннікам заўсёды ўжываецца назоўнік, напрыклад:

This is **my** mum. **Her** name’s Lily.

## Possessive case of nouns / Прыналежны склон назоўнікаў

Да назоўнікаў у адзіночным ліку, якія абазначаюць людзей ці жывёл і адказваюць на пытанні «чый?», «чыя?», «чыё?», «чые?», дабаўляецца ’**s**, напрыклад:

Maggie’**s** cat;
the boy’**s** pet;
Mrs Bell’**s** books.

Да назоўнікаў у множным ліку дабаўляецца «’», напрыклад:
the girl**s**’ parents.

## Demonstrative pronouns / Указальныя займеннікі

Займеннік **this** (гэты, гэтая, гэта) паказвае на прадмет, чалавека ці жывёліну ў адзіночным ліку, якія знаходзяцца побач з тым, хто гаворыць, напрыклад:

Look at **this** photo! **This** is my cat! **This** boy is my brother!

Займеннік **these** [ðiːz] (гэтыя) паказвае на прадметы, людзей ці жывёл у множным ліку, якія знаходзяцца побач з тым, хто гаворыць, напрыклад:

Look at **these** photos! **These** are my new friends! **These** pets are so funny!

# Numerals / Лічэбнікі

| **Cardinal numbers / Колькасныя лічэбнікі** (адказваюць на пытанне «колькі?») | | |
|---|---|---|
| **1** one | **11** eleven | **21** twenty-one |
| **2** two | **12** twelve | **22** twenty-two |
| **3** three | **13** thirteen | **30** thirty |
| **4** four | **14** fourteen | **40** forty |
| **5** five | **15** fifteen | **50** fifty |
| **6** six | **16** sixteen | **60** sixty |
| **7** seven | **17** seventeen | **70** seventy |
| **8** eight | **18** eighteen | **80** eighty |
| **9** nine | **19** nineteen | **90** ninety |
| **10** ten | **20** twenty | **100** a hundred |

# UNITS 3–4

## The Present Simple Tense / Цяперашні просты час

| Positive (+) | Negative (–) | |
|---|---|---|
| | Long form | Short form |
| I live in a house. | I **do not** live in a flat. | I **don't** live in a flat. |
| You live in a house. | You **do not** live in a flat. | You **don't** live in a flat. |
| He live**s** in a house. | He **does not** live in a flat. | He **doesn't** live in a flat. |
| She live**s** in a house. | She **does not** live in a flat. | She **doesn't** live in a flat. |
| It live**s** in a house. | It **does not** live in a flat. | It **doesn't** live in a flat. |
| We live in a house. | We **do not** live in a flat. | We **don't** live in a flat. |
| They live in a house. | They **do not** live in a flat. | They **don't** live in a flat. |

| Question (?) | Short answer | |
|---|---|---|
| | + | – |
| **Do** you live in a house? | Yes, I **do**.<br>Yes, we **do**. | No, I **do**n't.<br>No, we **do**n't. |
| **Does** he live in a house? | Yes, he **does**. | No, he **does**n't. |
| **Does** she live in a house? | Yes, she **does**. | No, she **does**n't. |
| **Does** it live in a house? | Yes, it **does**. | No, it **does**n't. |
| **Do** they live in a house? | Yes, they **do**. | No, they **do**n't. |

Цяперашні просты час ужываецца для таго, каб сказаць ці спытацца пра дзеянні, якія часта паўтараюцца або адбываюцца звычайна, часта, часам, заўсёды, напрыклад:

I usually get up at 7 a.m. My dad gets up at 6:30 every day.

**Паказальнікі цяперашняга простага часу:**

**usually** (звычайна), **often** (часта), **sometimes** (часам), **always** (заўсёды), **in the morning** (раніцай), **in the afternoon** (днём), **in the evening** (вечарам), **every day** (кожны дзень).

У 3-й асобе адзіночнага ліку да дзеяслова дабаўляецца канчатак **-s / -es**, які можа чытацца па-рознаму:

| **Пасля глухіх зычных гукаў –** [s] | **Пасля звонкіх зычных і галосных гукаў –** [z] | **Пасля шыпячых гукаў** (-sh [ʃ], -ch [tʃ], -tch [tʃ]) **і свісцячых гукаў** (-ss [s], -x [ks]) **–** [ɪz] |
|---|---|---|
| look**s** | run**s** | wash**es** |
| get**s** | go**es** | watch**es** |
| walk**s** | read**s** | dress**es** |

**Выключэнні:** do – do**es** [d^z]
have – ha**s** [hæz]

Правапіс дзеясловаў з канчаткам **-s / -es**:

• да дзеясловаў, якія заканчваюцца на **-o**, дабаўляецца канчатак **-es**, напрыклад:

g**o** – go**es**;
d**o** – do**es**;

• у дзеясловах, якія заканчваюцца на зычную **+ y**, літара **y** мяняецца на **i** і да дзеясловаў дабаўляецца канчатак **-es**, напрыклад:

fl**y** – fli**es**;
cr**y** – cri**es**.

# UNIT 5

## Degrees of comparison of adjectives / Ступені параўнання прыметнікаў

| Adjective / Прыметнік | Comparative degree / Вышэйшая ступень | Superlative degree / Найвышэйшая ступень |
|---|---|---|
| fast (хуткі) | fast**er** (хутчэйшы) | **the** fast**est** (самы хуткі) |
| beautiful (прыгожы) | **more** beautiful (прыгажэйшы) | **the most** beautiful (самы прыгожы) |

Існуе дзве ступені параўнання прыметнікаў: вышэйшая і найвышэйшая. Іх утварэнне адрозніваецца ў залежнасці ад колькасці складоў у прыметніках.

Прыметнікі, у якіх адзін склад, лічацца кароткімі, і для ўтварэння іх ступеняў параўнання выкарыстоўваюцца суфіксы **-er** і **-est**, напрыклад:

An elephant is **bigger** than a hippo.
A cheetah is **the fastest** animal.

Прыметнікі, у якіх два і больш складоў, лічацца доўгімі, і для ўтварэння іх ступеняў параўнання выкарыстоўваюцца словы **more** і **the most**, напрыклад:

I think, cats are **more beautiful** than dogs.
I think, horses are **the most beautiful** animals.

**Выключэнні:** good – better – the best
bad – worse – the worst

Правапіс прыметнікаў з суфіксамі **-er** і **-est**:

• невымоўная літара **e** знікае і да прыметнікаў дабаўляецца суфікс **-er** / **-est**, напрыклад:

nic**e** – nic**er** – the nic**est**;

• у аднаскладовых прыметніках з кароткім галосным гукам канчатковая зычная літара падвойваецца перад суфіксамі -**er** і -**est**, напрыклад:

hot – ho**tt**er – the ho**tt**est;

• калі прыметнікі заканчваюцца на зычную + **y**, літара **y** мяняецца на **i** і да прыметнікаў дабаўляецца суфікс -**er** / -**est**, напрыклад:

funn**y** – funn**i**er – the funn**i**est.